## ГАДАВАЯ СПРАВАЗДАЧА — ЗА ЛІЧАНЫЯ ДНІ

### Укараненне міжнародных стандартаў зробіць больш хуткай работу бухгалтараў

**З першага студзеня наступнага года шэраг прадпрыемстваў мусяць перайсці на міжнародныя стандарты фінансавай справаздачнасці (МСФС). Але наколькі гэта неабходна рабіць і галоўнае — як хутка? На гэтыя пытанні шукалі адказы падчас выязнога семінара члены Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, а таксама прадстаўнікі Міністэрства фінансаў і галоўныя бухгалтары буйных прадпрыемстваў.**

Для таго каб абмеркаванне было максімальна прадметным, удзельнікі сустрэчы накіраваліся ў горад Заслаўе, што ў Мінскай вобласці, на прадпрыемства «Хенкель Баутэхнік», што спецыялізуецца на вырабе будаўнічых матэрыялаў і карыстаецца МСФС ужо больш за пяць гадоў. Па словах **генеральнага дырэктара вытворчасці Сяргея НАВІЦКАГА** (да нядаўняга часу члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу), укараненне міжнародных стандартаў значна спрасціла падлікі, а таксама дапамагло ў планаванні работы прадпрыемства.

Але пакуль на МСФС мусіць перайсці толькі абмежаваная колькасць кампаній — грамадска-значымых. «Мы зрабілі высновы, што варта пашыраць іх колькасць, — паведаміла **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла ДАБРЫНІНА.** — Так, сёння яно вызначана, справаздачнасць у адпаведнасці з МСФС будзе зроблена за 2016 год, ідзе атэстацыя галоўных бухгалтараў. Мяркую, да разумення неабходнасці пераходу на гэтыя стандарты з цягам часу прыйдуць і буйныя кампаніі, і дзяржаўныя прадпрыемствы, і бізнес».

Па словах дэпутата, міжнародныя стандарты фінансавай справаздачнасці дазваляюць мець адзіную ацэнку эканамічнай сітуацыі таго ці іншага суб'екта гаспадарання. А для інвестараў гэта важна, бо яны звыклыя да работы з МСФС і ацэньваюць эканамічны стан прадпрыемства менавіта праз гэту сістэму. «Гэта дапаможа прыцягнуць прамыя замежныя інвестыцыі. Але трэба ўлічваць, што для пераходу патрэбны час, каб укараніць праграму, адшукаць аўдытарскую кампанію. І дадзены для гэтага тэрмін варта выкарыстоўваць разумна», — лічыць Людміла Дабрыніна.

На яе думку, адна з галоўных станоўчых рыс такой практыкі — паскарэнне працэсу фінансавага падліку, асабліва таго, што робіцца за ўвесь год. Ужо 3 студзеня ў «Хенкель Баутэхнік» ёсць гадавая справаздача, што дапамагае далей аператыўна прымаць кіраўніцкія і арганізацыйныя рашэнні.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

# ЛЮБІШ КАТАЦЦА...


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У студзені гэтага года, калі разбушаваўся цыклон Даніэла, Мінгарвыканкам рассылаў гараджанам SMS з просьбай прыбраць снег каля машына-месцаў і ў дварах. Тады гэты заклік выклікаў ажыятаж у грамадстве, аднак на сітуацыю практычна не паўплываў, таму на змену просьбам прыйшлі больш жорсткія меры. Дарэчы, усё новае — гэта добра забытае старое: тыя ж правілы дзейнічалі на працягу 13 гадоў, пакуль тры гады таму не былі адменены.

Сяргей Антонавіч — аўтаўладальнік з унушальным стажам, больш за 30 гадоў, ініцыятыву цалкам падтрымлівае. «Вы паспрабуйце праехаць снежнай зімой па вуліцах горада: там столькі машын прыпаркавана, якія з-за таго, што за імі ніхто не сочыць, ператвараюцца ў гіганцкія гурбы. З-за гэтага месца для іншых аўтамабіляў становіцца значна менш. Ды і наогул, пра што тут гаварыць: усе свядомыя гараджане і так зранку чысцяць месца вакол сваёй машыны. Новыя правілы павінны паўплываць на ўладальнікаў так званых пралесак, якія ствараюць масу праблем», — адзначыў мужчына.

> Найбольш горача абмяркоўваецца нававядзенне, якое датычыцца ўборкі дарогі каля прыпаркаванага аўтамабіля.

Перамены закранулі і ўласнікаў гаражоў, размешчаных у дварах. У іх абавязкі зараз уваходзіць утрыманне тэрыторыі вакол збудавання па перыметры.

Па-іншаму будзе арганізавана добраўпарадкаванне і ўтрыманне зямель агульнага карыстання. Пасля ўступлення рашэння ў сілу адміністрацыі раёнаў маюць права замацоўваць за юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, пэўныя ўчасткі.

Што да знешняга выгляду горада, то ён таксама трохіператворыцца. Так, не дапускаецца нанясенне фарбы на паверхню асфальту з мэтай размяшчэння на ім рэкламных аб'яў, а на шчытавых рэкламных канструкцыях нельга выкарыстоўваць паперу.



**У аснову новых правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання горада лёг Закон ад 12 ліпеня 2000 года «Аб статусе сталіцы Рэспублікі Беларусь — горада Мінска». Старая версія правілаў, якая дзейнічала 3 гады, страціла сваю сілу.**

**Артыкул 21.14 Кодэкса РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях пад назвай «Парушэнне правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў» папярэджвае:**

**1. Загрувашчванне вуліц, плошчаў, двароў, іншых зямель агульнага карыстання будаўнічымі матэрыяламі і іншымі прадметамі цягне накладанне штрафу ў памеры да пяці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад пяці да дзесяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад дзесяці да дваццаці базавых велічынь.**

**2. Парушэнне іншых правілаў добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў цягне накладанне штрафу ў памеры да дваццаці пяці базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад дзесяці да пяцідзесяці базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад дваццаці да ста базавых велічынь.**

Таццяна, студэнтка трэцяга курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, з такім указаннем згодна, але з пэўнымі агаворкамі. «Мяне, як чалавека з мастацкім бачаннем, такое «упрыгожванне» горада «рэкламай» проста абурае. Да таго ж гэта практычна не ўплывае на прыцягненне ўвагі да тавараў і паслуг. Тады дзеля чаго? Аднак нічым не лепш выглядаюць участкі, дзе гэтая рэклама зверху замазана. Над спосабамі працідзеяння яшчэ трэба працаваць. Шкада, што часта пакутуюць не толькі рэкламныя аб'явы, але і мілыя арт-малюнкі. Бо менавіта такія прывабныя дробязі робяць горад жывым».

Як указана ў новых правілах, яны прыняты з мэтай стварэння спрыяльных умоў жыццядзейнасці насельніцтва, а таксама фарміравання экалагічнага і пажарабяспечнага, эстэтычнага асяроддзя пражывання. У цэлым пад добраўпарадкаваннем і эксплуатацыяй тэрыторыі маецца на ўвазе будаўніцтва і ўтрыманне транспартнай інфраструктуры, водаадводных сістэм і абсталяванне вуліц, туалетаў, агароджаў, турнікетаў, малых архітэктурных формаў. Пералік даволі шырокі, сюды ж адносіцца і санітарная ачыстка і ўборка тэрыторыі, утылізацыя транспартных сродкаў, якія не эксплуатуюцца, утрыманне аб'ектаў расліннага свету, а таксама стварэнне месцаў і зон адпачынку.

Дарэчы, калі вы на добраахвотнай аснове за ўласныя сродкі хочаце акультурыць свой двор, напрыклад, змяніўшы аснашчэнне дзіцячай пляцоўкі або абсталяваўшы дадатковыя паркоўачныя месцы, то за гэта гатовыя ўзяцца арганізацыі, якія прадстаўляюць іншыя жыллёва-камунальныя паслугі.

Планы мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні горада на будучы 2017 год ужо складзены, да 1 снежня яны былі зацверджаны адміністрацыямі раёнаў. Традыцыйна ў вясновы і асенні перыяды дзеянні набываюць найбольш масавы характар: Мінгарвыканкам і адміністрацыі раёнаў арганізоўваюць месячнікі і суботнікі, да ўдзелу ў якіх прыцягваюцца юрыдычныя і фізічныя асобы.

**Дар'я КАСКО.** kasko@zviazda.by

## ЗРУЧНЫ І ДРУЖАЛЮБНЫ

**Пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза пачынаецца рэалізацыя праекта: «Наваполацк — ад інклюзіўнай школы да інклюзіўнага горада».**

— Наваполацк выбраў устойлівы шлях развіцця і імкнецца стаць сучасным еўрапейскім горадам, зручным для жыцця. Далучыўся да глабальнай ініцыятывы ЮНІСЕФ, накіраванай на абарону праваў дзяцей і стварэнне ўмоў для іх усебаковага развіцця. І першым у краіне атрымаў ганаровае званне «Горад, дружалюбны дзецям». Згаданы вышэй праект — працяг шэрагу ініцыятыў. Ён накіраваны на павышэнне якасці жыцця дзяцей і моладзі з інваліднасцю, — паведамілі нашаму карэспандэнту ў гарвыканкаме.

У ходзе рэалізацыі праекта, разлічанага на 3 гады, будзе пашырацца безбар'ернае асяроддзе ў школе №8, Палацы дзяцей і моладзі, іншых гарадскіх аб'ектах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** pukshanski@zviazda.by

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

# ВЫКАРЫСТАЦЬ УНІКАЛЬНУЮ МАГЧЫМАСЦЬ

### Краіна зацікаўлена ў развіцці дзяржаўнага сацыяльнага заказу

**У нас гэта паняцце малавядомае звычайным грамадзянам, ды і ўвогуле, сцвярджаюць практыкі, стаўленне да яго ў грамадстве несур'ёзнае. Нават спецыялізаваныя арганізацыі рэдка выкарыстоўваюць падобныя магчымасці. Тым не менш, за гэтым трошкі бюракратычным выразам стаяць звычайныя і часам вострa неабходныя паслугі: псіхалагічная кансультацыя, дапамога сядзелкі або няні.**

У большасці краін свету ўжо даўно створаны заканадаўчыя механізмы, якія дазваляюць прыцягваць да аказання сацыяльных паслуг розныя арганізацыі — як дзяржаўныя, так і прыватныя. Такім чынам, дзяржава выконвае тыя сацыяльныя задачы, якія перад ёю стаяць. На постсавецкай прасторы сістэма дзяржаўнага сацыяльнага заказу толькі-толькі прыжываецца. Тлумачыцца гэта і нетрадыцыйнасцю такой мадэлі для нашага рэгіёна.

На мінулым тыдні Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прыняла ў першым чытанні праект закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон «Аб сацыяльным абслугоўванні». Навацыі якраз у большасці сваёй і датычаць удасканалення дзяржаўнага сацыяльнага заказу ў нашай краіне.

**Таццяна СТАРЫНСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях,** растлумачыла, што пасля ўступлення ў сілу Закона «Аб сацыяльным абслугоўванні» прайшло ўжо нямала часу — ён дзейнічае з 2013 года.

— За апошнія гады шмат што змянілася. Напрыклад, распрацаваны новыя сістэмы, формы, віды сацыяльных паслуг, выраслі патрабаванні да іх якасці. Пачаў фарміравацца рынак сацыяльных паслуг — як з дзяржаўнымі, так і з недзяржаўнымі арганізацыямі. Гэта ўсё абумовіла карэкціроўку нормаў заканадаўства ў галіне сацыяльнага абслугоўвання, — адзначыла парламентарый.

У цэлым прадугледжваецца карэкціроўка 26 артыкулаў, два з якіх — у новай рэдакцыі. Перш за ўсё гэта датычыцца некамерцыйных арганізацый і міжнароднага супрацоўніцтва.

— Унесены дапаўненні ў паняцце дзяржаўнага сацыяльнага заказу, — дадала дэпутат. — Яго трэба разумець як аказанне сацыяльных паслуг пэўнай групе насельніцтва ў любой галіне, якая на сёння запатрабавана і якая не занятая дзяржаўнымі арганізацыямі, або калі апошнія не спраўляюцца з гэтымі задачамі.

Магчымасць удзелу некамерцыйных арганізацый у выкананні дзяржаўнага сацыяльнага заказу была і раней, зараз уносяцца дапаўненні па правядзенні конкурсу на такі заказ, а таксама па павелічэнні тэрміну заключэння дагавораў. Зноў жа, згодна з новым законапраектам, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы надзелены паўнамоцтвамі ўстанаўліваць для розных груп грамадзян новыя віды сацыяльных паслуг.

— Нягледзячы на ўжо трохгадовае існаванне дзяржаўнага сацыяльнага заказу, прыватныя арганізацыі не выкарысталі ў поўнай меры яго магчымасці. Выключэнне — Беларускі Чырвоны Крыж. Сёстры міласэрнасці ад гэтай арганізацыі працуюць як сядзелкі. Апошнім часам падобнай магчымасцю зацікавілася Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў. У асноўным жа некамерцыйныя арганізацыі, грамадскія аб'яднанні выкарыстоўваюць міжнародныя сацыяльныя праекты, для іх гэта больш прывабна. У той жа час у іх цяпер ёсць унікальная магчымасць развіваць сваю дзейнасць і з улікам дзяржаўнага сацыяльнага заказу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** yushkevich@zviazda.by